УДК 355.123(4БЕИ)

**У. В. Ляхоўскі**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

# НАСТУПСТВЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1914–1917 ГГ.) ДЛЯ ПРАМЫСЛОВАСЦІ І СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ МІНСКАЙ ГУБЕРНІ

У дадзеным артыкуле на падставе новых архіўных дакументаў, а таксама статыстычных матэрыялаў беларускіх эканамістаў пачатку 1920-х гг. прааналізаваны наступствы Першай сусветнай вайны для эканомікі Мінскай губерні. Падрабязна разгледжаны ўплыў на прамысловасць і сельскую гаспадарку Міншчыны масавай мабілізацыі мужчынскага насельніцтва ў царскую армію, эвакуацыйнай палітыкі расійскага ўрада, пераходу мясцовай прамысловасці на патрэбы войска і ваенную вытворчасць, а таксама ўвядзення «сухога закону».

**Ключавыя словы:** Першая сусветная вайна, Мінская губерня, прамысловасць, сельская гаспадарка, мабілізацыя, ваенныя заказы, «сухі закон», эвакуацыя, бежанства, рэквізіцыя.

**U. V. Lakhouski**
Belarusian State University

# EFFECTS OF THE FIRST WORLD WAR (1914–1917) FOR INDUSTRY AND AGRICULTURE OF MINSK PROVINCE

In this article, based on new archival materials, as well as statistical materials of Belarusian economists of the early 1920s. The multifactorial consequences of the First World War on the economy of Minsk province are analyzed. The impact on industry and agriculture of the Ministry of Mass Mobilization of the male population in the tsarist army, the evacuation policy of the Russian government, the transfer of local industry to the needs of the army and military production, as well as the introduction of a “Dry law”.

**Key words:** First World War, Minsk Province, industry, agriculture, mobilization, military orders, the dry law, evacuation, refugee, requisition.

**Уводзіны.** Без уліку ўздзеяння Першай сусветнай вайны на палітыку, эканоміку, культуру, духоўную і сацыяльна-псіхалагічную сферы жыцця грамадства нельга ў поўнай меры зразумець многія феномены мінулага стагоддзя – рэвалюцыі, узнікненне новых уладных рэжымаў і ідэалогій, новай масавай свядомасці. І калі раней прыярытэтамі пры яе вывучэнні з’яўляліся найперш разгляд баявых дзеянняў, асвятленне міжнародных адносін супрацьлеглых ваенных блокаў, то ў апошнія гады даследчыкі больш увагі сталі надаваць больш шырокай праблематыцы «вайна і грамадства». Пытанні сацыяльна-эканамічнага жыцця Беларусі падчас «Вялікай вайны» ў рамках названай тэмы, на наш погляд, па-ранейшаму застаюцца недастаткова вывучанымі.

**Асноўная частка.** Ацэньваючы эканамічнае развіццё Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст., варта сказаць, што ў гэты перыяд назіраўся ўстойлівы рост мясцовай эканомікі. Згодна наяўнай статыстыцы, гэты рост у Паўночна-Заходнім краі ў 1909 г. ў параўнанні з 1903 г. склаў 61,7%. Штогод гэты рост меў у сярэднім дынаміку ў 7% [1]. Нягледзячы на захаванне аграрнага характару краёвай гаспадаркі, быў заўважаны істотны рост мясцовай прамысловасці, а таксама актыўнае развіццё транспартнай і гарадской інфраструктуры, новых сродкаў сувязі (тэлефона і тэлеграфа). Разам з тым варта адзначыць, што аснову прамысловасці беларускіх губерняў складалі не буйныя, а невялікія прадпрыемствы, звязаныя з перапрацоўкай сельскагаспадарчай прадукцыі, лясных і мінеральных рэсурсаў (вытворчасць спірту, цукру, крухмалу, запалак, паперы, будаўнічых матэрыялаў, шкляных, гарбарных вырабаў ды г. д.). Эканамічны «бум» амаль не закрануў машынабудаванне, металургічную і тэкстыльную вытворчасць [2, с. 203].

«Вялікая вайна» рэзка пагоршыла эканамічнае становішча краю. Да гэтага часу дакладна не падлічаныя панесеныя Беларуссю дэмаграфічныя і эканамічныя страты падчас гэтага глабальнага канфлікту. На яе тэрыторыі адбываліся жорсткія баявыя дзеянні, якія прынеслі велізарныя чалавечыя ахвяры і разбурэнні. У навуковай літаратуры называецца лічба ў 100 тысяч чалавек – ураджэнцаў Беларусі, прызваных у царскае войска і загінуўшых на франтах той «забытай» вайны. Колькасць жа грамадзянскага насельніцтва, памерлага ад холаду, голаду і хвароб, ацэньваецца на парадак больш [3].

У гэты час істотна змяніўся полаўзроставы склад насельніцтва з-за масавай мабілізацыі мужчын прызыўнага ўзросту ў царскае войска, а таксама з-за эвакуацыі значнай часткі працаздольнага насельніцтва на ўсход. У сувязі з

гэтым зменшылася доля працаздольных мужчын (пасля 16 гадоў), як у агульным складзе насельніцтва, так і ў прапарцыянальных суадносінах да жанчын дадзенай узроставай групы.

Ужо ў першы год вайны, яшчэ да таго, як Беларусь апынулася ў зоне баявых дзеянняў, многія мясцовыя прадпрыемствы спынілі сваю вытворчасць з-за сваёй набліжанасці да раёна баявых дзеянняў ці з-за эканамічных цяжкасцей, звязаных з пастаўкамі сыравіны, адсутнасцю неабходных працаўнікоў, а таксама з транспартнымі праблемамі.

Пасля ўвядзення «сухога закону», які забараніў выраб на продаж спірту і алкагольнай прадукцыі, у жніўні 1914 г. спынілі сваю вытворчасць усе мясцовыя бровары. Толькі ў межах Мінскай губерні да пачатку 1915 г. з 521 мясцовага прадпрыемства не функцыянавала каля 220, з якіх 172 з'яўляліся вінакурнымі броварамі і спіртарэктыфікацыйнымі заводамі, 16 – лесапільнымі і дрэваапрацоўчымі, 3 – вадзянымі млынамі, 7 – фабрыкамі па вытворчасці крухмалу, 3 – па вытворчасці шкла, 3 – цаглянымі заводамі і яшчэ 16 рознага профілю. Адначасова былі разабраны і вывезены каля 30 лакамабілей, звыш 200 паравых катлоў, звыш 180 паравых машын, бензінавых і газавых рухавікоў, больш за 600 розных відаў помпаў, каля 40 дынама-машын і электраматораў, звыш 50 лесапільных рам і механічных станкоў па дрэву, каля 500 розных станкоў і прылад па апрацоўцы металу, звыш 2 тысяч розных механічных інструментаў і прыстасаванняў, каля 300 ваганетак ды іншага абсталявання.

Улетку 1915 г. падчас «вялікага адступлення» расійскай арміі было вывезена за межы Беларусі абсталяванне дзясяткаў заводаў і фабрык разам з тысячамі кваліфікаваных спецыялістаў і рабочых. Шмат што было проста знішчана («каб не засталося ворагу»). Такі лёс напаткаў дзясяткі заводаў і фабрык з Мінска, Віцебска, Слуцка, Бабруйска, Барысава і іншых гарадоў з цэнтральнай часткі Беларусі. Сярод вышэйзгаданых прадпрыемстваў, якія спынілі сваю вытворчасць, галоўны фабрычны інспектар Мінскай губерні адзначыў толькі тыя, што падлягалі інспектарскаму нагляду паводле інструкцыі міністэрства гандлю і прамысловасці Расіі. Дробныя саматужныя адзінкі вытворчасці, у якіх налічвалася меней за 5 працаўнікоў (напрыклад, гарбарні), не ўлічваліся [4; 5, арк. 64–73].

Былі эвакуіраваны нават прадпрыемствы ў далёкім тыле. Напрыклад, была вывезена на ўсход значная частка мінскіх прадпрыемстваў: галантарэйныя фабрыкі таварыства «Ф. Турнье», завод па вытворчасці крухмалу і патакі таварыства «Прасвет», парфумнай фабрыкі «Вікторыя» Ш. Данішэўскага, машынабудаўнічыя заводы таварыстваў «Н. Якабсан і Г. Ліфшыц», заводы металавырабаў «Тэхнолаг» і акцыянераў М. Шлапакова і М. Майзеля, кацельны завод Г. Янішэўскага, абутковыя фабрыкі акцыянерных таварыстваў «Скараход», «Русь» і «Арол» ды інш. [5, арк. 72–73].

Нярэдка ваеннаму камандаванню было прасцей знішчыць каштоўнае абсталяванне, чым займацца яго доўгім дэмантажом і пагрузкай на цягнік ці аўтамабілі для эвакуацыі. Так, бяздумна было знішчана дарагое абсталяванне прадпрыемстваў, якія можна было па праву назваць індустрыяльнымі флагманамі Беларусі: станкі і прылады суконнай фабрыкі Р. Скірмунта у вёсцы Парэчча Пінскага павета, прадпрыемства па вырабу тэхнічнай паперы і кардону «Куль» М. Новікавай пад Стоўпцамі, шаўкакрутнай фабрыкі Анджэта ды інш. [5, арк. 64–73].

Паказальны тут лёс Парэчанскай суконнай фабрыкі вядомага прадпрымальніка і грамадска-палітычнага дзеяча Р. Скірмунта. Дзякуючы закупленым англійскім і нямецкім станкам апошняя штогод вырабляла да 6 тысяч пудоў высакаякаснага сукна. Сюды былі запрошаны на працу з-за мяжы каля 20 інжынераў-тэхнікаў і іншых кваліфікаваных спецыялістаў, што абслугоўвалі ткацкія машыны, кіравалі вытворчым працэсам і навучалі працаваць з новай тэхнікай мясцовых рабочых (усяго звыш 200 чалавек) [6, арк. 7].

З пачаткам вайны замежных «спецоў» амаль адразу ж інтэрніравалі як грамадзян варожых дзяржаў (Нямеччыны і Аўстра-Венгрыі) [6, арк. 9]. Р. Скірмунт паспрабаваў пераарыентаваць сваю вытворчасць на выраб буркаў для афіцэраў царскай арміі. Улетку 1915 г. ён знаходзіўся ў ад'ездзе і позна спахапіўся, занепакоіўшыся лёсам свайго прадпрыемства. У канцы жніўня таго ж года ён тэрмінова звязаўся з Тэхнічным саветам Міністэрства гандлю і прамысловасці, а таксама з кіраўніком Усерасійскага таварыства суконных фабрыкантаў і папрасіў апошніх пасадзейнічаць у тэрміновай эвакуацыі Парэчанскай фабрыкі ў Тамбоў ці Сімбірск. Але тэлеграма з Петраграда ў Мінскае ваенна-акруговае інтэнданцкае ўпраўленне ад 8 верасня 1915 г. запазнілася. Старшы фабрычны інспектар Мінскай губерні паведамляў свайму начальству 18 кастрычніка 1915 г., што фабрыку перад прыходам немцаў эвакуіраваць не ўдалося і вывезены былі толькі рэшткі сукна і воўны; машыны ж «прыведзены ў поўную непрыдатнасць» [6, с. 10–11].

На большасці прадпрыемстваў Беларусі, якія працягвалі працаваць, рэзка скарацілася вытворчасць па прычыне фінансавых праблем, недахопу сыравіны, адсутнасці попыту, транспартных перабояў, недахопу працоўных рук і замены працаўнікоў-мужчын жанчынамі і пад-

леткамі. Так, Барысаўская запалкавая фабрыка «Вікторыя» скараціла вытворчасць да канца 1916 г. на 60%, а колькасць рабочых на прадпрыемстве скарацілася амаль у 3 разы: з 605 да 262. Працаздольнасць на менскай шпалернай фабрыцы Кантаровіча знізілася на 80%, а колькасць працоўных месц скарацілася там у 6 разоў(!): з 359 да 60. Вялізны спад вытворчасці адбыўся на шклозаводах Беларусі. Так, на Мінскай шкляной фабрыцы таварыства «І. Бацвіннік і Б. Ашкеназі» выпуск прадукцыі ўпаў на 85%, а са 175 працаўнікоў засталося працаваць толькі 22 [6, арк. 12]. Некаторыя прадпрыемствы, напрыклад Смілавіцкая фабрыка ботавых абцасаў Л. Суціна і Зялёнкаўскі фанерны завод І. Краснаполя (Асавецкая воласць Бабруйскага павета), вымушаныя былі прастойваць некалькі месяцаў у 1915 г. па прычыне разрабавання і частковага знішчэння драўлянай сыравіны праходзячымі на ўсход ўцекачамі [7]. Пад уздзеяннем усіх гэтых негатыўных фактараў паступова развальвалася эканоміка, што ў сваю чаргу ўплывала і на сацыяльна-палітычную атмасферу ў гарадах.

Моцнай дэфармацыі ў гэты ваенны час падвергся беларускі сельскагаспадарчы рынак. Летам – восенню 1915 г. многія сялянскія і абшарніцкія гаспадаркі заходняй часткі Беларусі ў выніку астаўлення гэтай тэрыторыі расійскім войскам і прымусовай эвакуацыі насельніцтва спынілі сваё існаванне. На ўсход ад нямецка-расійскага фронту найбольшую рэгрэсію перажылі якраз тыя сегменты сельскагаспадарчай вытворчасці, якія найбольш дынамічна развіваліся ў даваенны час і былі арыентаваны ў першую чаргу на рынак. На гэтыя працэсы негатыўна паўплывалі наступныя фактары:

1) масавая мабілізацыя ў войска большасці працаздольных мужчын з вёскі, аслабленне вытворчых магчымасцей вясковых гаспадарак у выніку рэквізіцыі цяглавай жывёлы, нярэдкая бескантрольная рэквізіцыя прадуктаў сельскагаспадарчай вытворчасці і хатняй «жыўнасці» з боку армейскіх частак ці проста рабаванне ўраджаю ўцекачамі;

2) масавыя сялянскія рабаванні абшарніцкіх фальваркаў у канцы 1917 – пачатку 1918 г. (апошнія больш, чым сялянскія гаспадаркі, вызначаліся прагрэсіўнай формай гаспадарання і актыўна працавалі на рынак);

3) рэзкая змена рынкавай кан'юнктуры сельскагаспадарчага рынку падчас вайны, выкліканая ўвядзеннем «сухога закону», а таксама мерамі царскага ўрада па пераарыентацыі мясцовай сельскай гаспадаркі на патрэбы войска;

4) дэзарганізацыя сістэмы кіравання, перакос цэнавай палітыкі ў дачыненні да аграрнага сектара, нарастанне транспартных праблем па дастаўцы сельскагаспадарчай прадукцыі на спажывецкія рынкі ды інш. [8].

Спыненне вытворчасці спірту для вырабу гарэлкі і іншых алкагольных напояў, рэзкае скарачэнне экспарту за межы Расійскай імперыі і адначасовае павелічэнне ваенных замоў на пастаўкі арміі харчавання і фуражу абумовілі пашырэнне ў Беларусі ў пачатковы перыяд «германскай» вайны (1914–1915 гг.) пасеваў збожжа і кармавых траў пры паралельным змяншэнні пасеваў бульбы, лёну і канопляў. Падчас вайны ў Беларусі катастрафічна скарацілася пагалоўе буйной рагатай жывёлы (да 78%) [9], што тлумачылася, па-першае, вялікімі стратамі, панесенымі гэтай галіной жывёлагадоўлі падчас эвакуацыі з заходніх рэгіёнаў Беларусі, па-другое, заняпадам галоўных пастаўшчыкоў гэтай катэгорыі хатняй жывёлы на рынак – абшарніцкіх фальваркаў (дробныя сялянскія гаспадаркі, як правіла, трымалі буйную рагатую жывёлу ў асноўным для сваіх вытворчых і спажывецкіх патрэб і не гадавалі іх дзеля продажу на рынак).

Адначасова на Міншчыне, Віцебшчыне і Магілёўшчыне адбылося павелічэнне пагалоўя коней на 5% і свіней аж на 20% [9]. 5-працэнтнае павелічэнне конскага пагалоўя, нават з улікам рэквізаваных у 1915 г. «цяглавых жывёл» на патрэбы войску, тлумачыцца тым, што ўцекачы з польскіх і балтыйскіх губерняў, рухаючыся на ўсход праз Беларусь, з-за недахопу фуражу і па іншых прычынах мусілі за бясцэнак прадаваць або аддаваць задарма коней мясцовым сялянам. Колькасны «скок» пагалоўя свіней можна аргументаваць уплывам двух фактараў: па-першае, тутэйшае жыхарства ўзялося за масавае гадаванне парсюкоў, каб «ліквідаваць» значныя лішкі бульбы, што засталіся пасля забароны прамысловай вытворчасці харчовага спірту, а па-другое, развядзенне свіней ва ўмовах рэзкага звужэння сельскагаспадарчага рынку і фактычнага пераходу гэтага сектара прыватнай эканомікі Беларусі да «натуральнай гаспадаркі» – справа больш рэнтабельная, чым, напрыклад, гадаваць буйную рагатую жывёлу. Адзначым, што ў сялянскіх гаспадарках нязначна скарацілася гадоўля авечак, што амаль выключна задавальняла «натуральныя патрэбы» сялян [9].

У верасні 1917 г. зноў змяніліся правілы рэквізіцыі хатняй жывёлы з сяланскіх гаспадарак. Паводле інструкцыі галоўнакамандуючага Заходняга фронту ад 8 верасня 1917 г. (вых. № 2090/XXVII) былі зацверджаны наступныя нормы ўтрымання «жыўнасці» вясковым насельніцтвам: не належала рэквізіцыі адна карова на 5 едакоў (але не менш за адну карову на адну гаспадарку), адна пара коней або валоў на

10 дзесяцін ворнай зямлі (калі гаспадар меў менш за 6 дзесяцін ворыва, то яму пакідалі аднаго каня або адну пара валоў), адна свіння, а таксама свінаматка з маладняком. Вайсковыя інтэнданты не забіралі таксама жарабят да года і да 20% конскага маладняку ва ўзросце 1–1,5 года [10, арк. 30].

З'яўленне і нарастанне вялікай разбежнасці ў цэнавых індэксах прамысловых і сельскагаспадарчых тавараў на карысць першых, істотнае зніжэнне, пачынаючы з 1917 г., паставак харчавання і фуражу для войска прывяло да таго, што ў Цэнтральнай і Усходняй Беларусі значна (да 66%) скараціліся пасяўныя плошчы ўсіх раслінных культур. Праблемы з харчаваннем прымусілі Часовы ўрад увесці 25 сакавіка 1917 г. хлебную манаполію, якая прымушала сялян здаваць жыта і пшаніцу па фіксаваных «цвёрдых» цэнах без уліку інфляцыі [11]. З 7 ліпеня 1917 г., паводле загада расійскага міністэрства харчавання № 14, таксама ўводзіліся цвёрдыя кошты на цукар і цукровыя вырабы [12, арк. 87].

З мэтай адзінства кіравання нарыхтоўкай і забеспячэннем насельніцтва і арміі прадуктамі харчавання і таварамі першай неабходнасці Часовы ўрад пайшоў на стварэнне цэнтралізаваных «глаўкаў», напрыклад: «Хлебармия» (кіравала закупамі хлеба і фуражу, рэгулявала пытанні, звязаныя з рэквізіцыямі і вывазам хлеба і фуражу для буйных гарадоў), «Заготосель» (нарыхтоўка мяса, жыроў, гародніны), «Центромука», «Центротранспорт» (выдача дазволаў на перавозку харчавання і фуражу, забеспячэнне транспартнымі сродкамі), «Центросчет» (фінансаванне і бухгалтарскі ўлік закупаў харчавання і фуражу) [12, арк. 78]. Былі ўпершыню агучаны прапановы па нацыяналізацыі скураных прадпрыемстваў і вытворчасці тытуню і папірос [13, арк. 81; 14, арк. 1–2].

Такім чынам, з лета 1917 г. быў забаронены прыватны гандаль харчовага зерня, цукру, некаторых відаў гародніны. Адказнымі за нарыхтоўку зерня і іншых харчовых прадуктаў для насельніцтва і вайсковых частак упаўнаважваліся губернскія і павятовыя харчовыя камітэты [13, арк. 10]. Апошнія прыступілі да ўліку пададзеных сялянамі, абшарнікамі, кааператывамі ды рознымі артэлямі наяўнага ў іх хлеба і фуражу. Таксама забіраліся лішкі «стратэгічнай» гародніны: пакідалі толькі 1–1,5 пуда бульбы і 12,5 фунтаў іншай гародніны на едака; для насення – да 130 пудоў бульбы і 10 пудоў бабовых на кожную дзесяціну пасяўных угоддзяў [10, арк. 30 адв]. Схаваныя запасы харчавання неадкладна рэквізаваліся па палавінным кошце паводле арт. 8 вышэй узгаданага закона [13, арк. 11].

Цэнавы хаос, парадзіўшы істотную рознасць у коштах на дэфіцытныя прадукты і рэчы ў розных рэгіёнах Расіі, прывёў да ўзмацнення эканамічнай аўтаркіі. Дзеля таго каб спыніць спекуляцыю і масавы вываз тавараў штодзённага попыту за межы губерні і нават павета, земскімі і гарадскімі ўправамі ўводзілася бонавая (талонная) сістэма. Узмацніўся кантроль за паштовымі адпраўленнямі за межы губерні. Паводле загада Мінскага губернскага харчовага камітэта ад 27 верасня 1917 г., дзеля спынення вывазу дэфіцытных прадуктаў з рэгіёна праз паштовыя адпраўленні былі прыняты наступныя меры: а) забаранялася перасылаць з паштовых аддзяленняў Мінскай губерні пасылкі з цукрам, цукровымі і шакаладнымі вырабамі, мукой, рознымі крупамі, сырым мясам, соллю, рыбай, абаранкамі, алеем, сырам, каўбасой, вяндлінай, тытунём, запалкамі, свечкамі, мануфактурай, сукном, скуранымі вырабамі, абуткам, галёшамі ды іншымі рэчамі; б) у межах губерні дазвалялася перасылаць харчовыя прадукты вагой не болей за 12 фунтаў адной асобай ў адной пасылцы і адзін раз у дзень; в) служачым пошты дазвалялася пры неабходнасці ўскрываць пасылкі і аглядаць яе ўкладанні; г) у выпадку парушэння ўзгаданых правіл па перасылцы прадуктаў і рэчаў адправіцель караўся грашовым штрафам, а сама пасылка падлягала канфіскацыі [14, арк 86–86 адв].

Усе гэта моцна адбілася на забеспячэнні харчаваннем вайсковых частак Заходняга фронту, размешчанага на тэрыторыі Мінскай губерні. Пасля збору ўраджаю летам 1917 г. падвоз харчавання ў вайсковыя інтэнданцкія аддзелы упаў на 12–40%: мукі было не дададзена каля 40%, розных круп – на 32%. Было таксама падлічана, што калі адняць колькасць прадуктаў, выкарыстаных рознымі тылавымі ўстановамі і паўваеннымі структурамі, то лінейныя часткі, стаяўшыя на перадавой лініі, атрымлівалі мукі ад 20 да 30%, фуражу і сена ад 40 да 50% [15]. Каб неяк папоўніць запасы хлеба і фуражу, камандаваннем Заходняга фронту быў выдадзены загад аб новых рэквізіцыях у 30-вёрстнай прыфрантавой паласе [15]. Армейскімі інтэндантамі паведамлялася, што ў Мінскай губерні знаходзяцца мільёны пудоў ўжо купленага сена, але вывезці яго да чыгуначных станцый няма на чым.

У кастрычніку 1917 г. адмысловая камісія Заходняга фронту па забеспячэнні армій харчаваннем і фуражом дакладвала камандаванню, што крытычнае становішча фронту ў цяперашні час ёсць наступствам гаспадарчай разрухі краіны. Падвоз хлеба і фуражу значна скараціўся ў сілу поўнай адсутнасці належнай увагі тылу да патрэб войска, у прыватнасці сялянства, а таксама хлебнай манаполіі, нізкіх цвёрдых цэн на прадметы першай неабходнасці [15].

Увядзенне харчовай развёрсткі і гіперцэнтралізацыя справы па нарыхтоўцы і размеркаванні харчавання Часовым урадам не палепшылі сітуацыю, а наадварот, яшчэ больш абвастрылі харчовы крызіс у краіне. Сяляне ў адказ на харчразвёрстку і несправядлівую цэнавую палітыку расійскага ўрада адмовіліся добраахвотна прадаваць лішкі зерня за абясцэненыя «керанкі» і ўвосень 1917 г. фактычна адмовіліся ад сяўбы азімых [9]. Для «ўнутранага спажывання» вясной 1918 г. яны засеялі на мінімальных плошчах яравыя культуры (грэчку, жыта і пшаніцу). На фоне масавага руйнавання буйных абшарніцкіх маёнткаў раўналежна адбывалася «натуралізацыя» сялянскіх гаспадарак, якія калі і прадавалі нешта, дык толькі на бліжэйшых гарадскіх кірмашах і прычым дробнымі партыямі. Вываз сельгаспрадукцыі за межы Беларусі фактычна спыніўся.

**Заключэнне.** Непадрыхтаванасць Расіі да працяглай вайны, сур’ёзныя памылкі царскага і Часовага ўрадаў ў рэалізацыі сваёй эканамічнай палітыкі, архаічная сістэма кіравання ды іншыя негатыўныя аспекты спарадзілі рэзкае пагаршэнне сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў краіне. Непрадуманае ўвядзенне падчас вайны «сухога закону» падарвала важную галіну беларускай прамысловасці, якая спецыялізавалася на вытворчасці спірту, адначасова пагоршыла фінансавае становішча краю, спарадзіла масавае самагонаварэнне. Гэта моцна паўплывала на падзенне грамадскай маралі ў гарадах і вёсках краю. Не меншую шкоду прынеслі сур’ёзныя недахопы ў аграрнай і цэнавай палітыцы. Гэта прывяло да масавай «натуралізацыі» беларускіх сялянскіх гаспадарак. Масавая эвакуацыя грамадзянскага насельніцтва з пакідаемых праціўніку тэрыторый на ўсход, дрэнна арганізаваная эвакуацыя мясцовых прадпрыемстваў павялічылі матэрыяльныя і фінансавыя страты Беларусі і Міншчыны ў прыватнасці. Усё гэта абвастрыла сацыяльна-палітычныя супярэчнасці у грамадстве і прадвызначала крах старога рэжыму.

## Літаратура

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 325. Воп. 1. Спр. 19. Арк. 129–137; 139–143.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 тамах. Том 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.). Мінск: Экоперспектива, 2005. 519 с.

3. Рудовіч С. Час выбару: праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе. Мінск: Тэхналогія, 2001. С. 31.

4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (далей – НГАБ). Ф. 62. Воп. 3. Спр. 6. Арк. 1.

5. НГАБ. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 92.

6. НГАБ. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 78.

7. НГАБ. Ф. 311. Спр. 93. Арк. 118–118 адв.

8. НГАБ. Ф. 62. Воп. 3. Спр. 6. Арк. 1–15.

9. Бонч-Осмоловский Р. А. Эволюция сельского хозяйства Белоруссии. Ч. II. Военно-революционный и послереволюционный период // Советское строительство. 1925. № 4. С. 31–47.

10. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (далей – ДАМВ). Ф. 1743. Воп. 1. Спр. 7.

11. Данилов В. П. Крестьянская революция в России, 1902–1922 гг. // Крестьяне и власть: материалы конференции. Москва; Тамбов: ТГТУ, 1996. С. 4–23.

12. ДАМВ. Ф. 1743. Воп. 1. Спр. 10.

13. ДАМВ. Ф.1743. Воп. 1. Спр. 1.

14. ДАМВ. Ф. 1743. Воп. 1. Спр. 11.

15. Протокол общего собрания членов фронтового комитета Западного фронта. 16 октября 1917 года // Фронт (Мінск). 1917, 24–25 окт., 28 окт.

## References

1. The National Archives of the Republic of Belarus (NARB). F. 325. Inv. 1. File 19. Sh. 129–137; 139–143.

2. *Historyya Bielarusi: u 6 tamakh. Tom 4. Bielarus’ u skladzye Rasiyskay impieryi (kaniec XVIII – pachatak XX st.)* [History of Belarus: in 6 volumes. Vol. 4. Belarus within the Russian Empire (end of the XVIII – beginning of the XX century)]. Minsk, Ekoperspektiva Publ., 2005. 519 p.

3. Rudovich S. *Chas vybaru: prablema samavyznachennya Bielarusi u 1917 godzie* [The time of choice: the problem of self-determination of Belarus in 1917]. Minsk, Tekhnalogiya Publ., 2001. P. 31.

4. National Historical Archives of Belarus in Minsk (NIAB). F. 62. Inv. 3. File 6. Sh. 1.

5. NHAB. F. 311. Inv. 1. File 92.

6. NHAB. F. 311. Inv. 1. File 78.

7. NHAB. F. 311. Inv 1. File 93. Sh. 118–118 rev.

8. NHAB. F. 62. Inv. 3. File. 6. Sh. 1–15.

9. Bonch-Osmolovsky R. A. The evolution of agriculture in Belarus. Part II. Military revolutionary and post-revolutionary period. *Sovetskoye stroitel'stvo* [Soviet construction], 1925, no. 4, pp. 31–47 (In Russian).

10. The State Archives of Minsk Region (SAMR). F. 1743. Inv. 1. File 7.

11. Danilov V. P. The peasant revolution in Russia, 1902–1922. *Krest'yane i vlast': materialy konferentsii* [Peasants and power. Conference proceedings]. Moscow; Tambov, TSTU, 1996, pp. 4–23 (In Russian).

12. SAMR. F. 1743. Inv. 1. File 1.

13. SAMR. F. 1743. Inv. 1. File 10.

14. SAMR. F. 1743. Inv. 1. File 11.

15. Minutes of the general meeting of members of the front committee of the Western Front. October 16, 1917. *Front (Minsk)* [Front (Minsk)]. 1917, 24–25, 28 Oktober (In Russian).

## Інфармацыя пра аўтара

**Ляхоўскі Уладзімір Віктаравіч** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры мытнай справы. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (220030, г. Мінск, вул. Ленінградская, 20, Рэспубліка Беларусь). E-mail: prysynak@gmail.com

## Information about the author

**Lakhouski Uladzimir Viktaravich** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of Customs Affairs. Belarusian State University (20, Leningradskaya str., 220030, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: prysynak@gmail.com

*Паступіў 10.09.2018*